УДК 973.091.7

*І.В. Варывончык,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ*

# ЗША Ў ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ: ПРАБЛЕМЫ ЎНУТРАНАГА РАЗВІЦЦЯ*

У канцы 1940 г. (7 снежня) японскі флот у складзе 60 баявых караблёў, які здзейсніў паход у 3 тыс. міль, дасягнуў пастаўленай мэты – японская армада і яе галоўная ўдарная сіла (6 авіяносцаў з 350 самалётамі на борце) здолелі незаўважанымі перасекчы Ціхі акіян. Да галоўнай ваенна-марской базы ЗША ў Пёрл-Харбары заставалася 230 міль. Атака стала поўнай нечаканасцю для амерыканскіх ваенных. Былі патоплены і пашкоджаны 8 лінкораў, знішчана 160 самалётаў, забіта 2403 і ранена 1178 амерыканцаў. Гэта падзея зрабіла непазбежным уступленне ЗША ў Другую сусветную вайну. Палітыка ізаляцыянізму цярпела крах. Жаданню амерыканцаў застацца ў баку ад разгараўшагася сусветнага пажару не суджана было спраўдзіцца. Прапанова прэзідэнта Ф. Рузвельта аб пакаранні агрэсара і аб'яўленні вайны была падтрымана Кангрэсам 388 галасамі. Супраць галасаваў толькі адзін кангрэсмен ад штата Мантана Джанет Рэнкін, якая ў 1917 г. галасавала і супраць удзелу ЗША ў Першай сусветнай вайне.

* Пачатак у № 1 (прадаўжэнне ў наступных нумарах).

Вайна стала стымулам для дынамічных эканамічных і сацыяльных пераўтварэнняў. К сярэдзіне 1941 г. праблемы 1930-х гг. – беспрацоўе, дэфляцыя, невысокія тэмпы прамысловага росту – засталіся ў мінулым, разбуральныя вынікі крызісу 1929–1932 гг. былі канчаткова пераадолены. Краіна перажывала перыяд хуткага развіцця, вынікі якога прадвызначылі як яе становішча ў сучасным свеце, так і якасныя змены ў жыцці саміх амерыканцаў.

***Дзяржаўнае рэгуляванне і рост дзяржаўнага апарату.*** Вядучую ролю ў кардынальных зменах адыгрывала дзяржава. Яна стварала магутныя ўзброеныя сілы, кіравала ваеннай вытворчасцю, рэкрутавала неабходную рабочую сілу, кантралявала інфляцыю, планавала вытворчасць і спажыванне асноўных тавараў на ўнутраным рынку. Праз месяц пасля ўступлення краіны ў вайну рашэннем прэзідэнта Ф. Рузвельта быў створаны Камітэт ваеннай вытворчасці (War Production Board), закліканы каардынаваць перавод амерыканскай эканомікі на ваенныя рэйкі. Урад забяспечыў цеснае супрацоўніцтва з буйным бізнесам, заснаванае на выгадных для яго ўмовах. Яны прадугледжвалі скарачэнне падаткавай нагрузкі, прыпыненне дзейнасці антытрэстаўскіх законаў і шчодрае дзяржаўнае фінансаванне.

З 1940 г. і далей дзяржаўныя капіталаўкладанні ў эканоміку на працягу аднаго года перавышалі суму ўсіх капіталаўкладанняў у праграмы «новага курсу». Дзяржаўны бюджэт краіны вырас з 9 млрд долараў у 1939 г. да 100 млрд долараў у 1945 г. [1, с. 729]. У 1942 г. Кангрэс пагадзіўся з прапановай прэзідэнта аб стварэнні Упраўлення цэнамі (Office of Price Administration), асноўнай задачай якога была барацьба з пагрозай інфляцыі шляхам рэгулявання цэн, зарплат і стварэння складанай сістэмы рацыяніравання дэфіцытных тавараў спажывецкага рынку. Пашырэнне рэгулятыўных функцый дзяржавы прывяло да беспрэцэдэнтнага росту дзяржаўных ведамстваў, федэральнага ўрада. За перыяд вайны з 1941 па 1945 г. расходы ўрада склалі 321 млрд долараў, што было ў два разы больш чым яго расходы за ўсе папярэднія 150 гадоў. Дзяржаўны доўг вырас з 49 да 259 млрд долараў [1, с. 730]. З 1940 па 1945 г. колькасць дзяржаўных служачых павялічылася з 1,1 да 3,4 млн чалавек [2, с. 791].

***Прамысловая вытворчасць.*** Значная частка 160 з 240 млрд дзяржаўных ваенных кантрактаў дасталася 100 найбольш буйным кампаніям. Выраслі даходы буйнога бізнесу. Амерыканская прамысловасць паказала сваю эфектыўнасць, аказалася здольнай задавальняць узнікаўшыя патрэбы. Прамысловая вытворчасць вырасла ў тры разы. Даходы амерыканскіх карпарацый з 1939 па 1943 г. падвоіліся і склалі 70 млрд долараў [4, с. 580]. Патрэбны былі новыя вытворчыя магутнасці. Змянілася сітуацыя на рынку працы. Замест шматгадовага беспрацоўя ўзнік дэфіцыт рабочай сілы. Так, вытворчасць ваенных самалётаў узрасла з 6 тыс. адзінак у 1940 г. да 85 тыс. у 1943 г. Значную ролю ў гэтым адыгралі амерыканскія жанчыны, колькасць якіх на авіяцыйнай вытворчасці выраcла з 4 тыс. у снежні 1941 г. да 310 тыс. у канцы 1943 г. Першасныя ацэнкі магчымасцей караблебудаўніцтва па выпуску аднаго новага карабля раз у паўгады былі скарэкціраваны рэальнасцю да 56 дзён у 1943 г. і 14 дзён, а к канцу вайны 12 дзён у адносінах да дэсантных караблёў тыпу «Свабода» [3, с. 8].

Патрэбы вайны прывялі да ўзнікнення новых вытворчасцей. У выніку тэрытарыяльных захопаў пад кантролем Японіі аказалася 90 % вытворчасці каўчуку. Для эканоміі рызіны былі ўведзены абмежаванні хуткасці, лімітаваны продаж бензіну, але гэта не вырашала праблем вытворчасці ваеннай тэхнікі. У 1942 г. дзяржава інвесціравала ў вытворчасць штучнага каўчуку 700 млн долараў. Вынікам стала стварэнне прынцыпова новай вытворчасці, краіна ператварылася з вядучага імпарцёра натуральнага каўчуку ў вядучага экспарцёра рызінавых вырабаў.

Хуткі рост прамысловасці меў негатыўныя вынікі для экалогіі ў асобных раёнах і гарадах. У 1943 г. Лос-Анжэлес упершыню ў сваёй гісторыі сутыкнуўся са смогам. У некалькі разоў павялічылася скіданне адходаў хімічнай вытворчасці ў рэкі і азёры. Ва ўмовах вайны гэта не стала прадметам неспакою грамадскасці. Прыродныя рэсурсы Амерыкі ўяўляліся невычарпальнымі, а шкода навакольнаму асяроддзю не такой істотнай.

***Сельская гаспадарка.*** З 1940 па 1945 г. кошт выкарыстоўваемай сельскагаспадарчай тэхнікі вырас з 3,1 да 6,5 млрд долараў, а колькасць занятых скарацілася з 30,5 да 24,4 млн чалавек. Вайна стымулявала пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы. Дробныя фермерскія гаспадаркі не вытрымлівалі канкурэнцыі [2, с. 791].

Узмоцненая міграцыя рабочай сілы ў гарады і паскораная механізацыя паскорылі працэс пераходу ад сямейнай фермерскай гаспадаркі да буйной таварнай вытворчасці, у якой дамінавалі банкі, страхавыя кампаніі і сельскагаспадарчыя кааператывы.

***Навука і ваенныя распрацоўкі.*** Пашырылася дзяржаўнае фінансаванне навукі і вышэйшых навучальных устаноў. Найбольш яркім прыкладам сумеснага праекта ўрада, арміі і універсітэтаў стала стварэнне ядзернай бомбы. З 1942 г. неабходныя даследаванні фінансаваліся ў Чыкагскім універсітэце. Універсітэт у Берклі стаў базай для стварэння цэнтра ў Лос-Аламасе і рэалізацыі знакамітага Манхэтанскага праекта. Актыўны ўдзел у распрацоўцы радарнай тэхнікі прымалі вучоныя Масачусецкага тэхнала-

гічнага інстытута, Гарварда, Калумбійскага універсітэта. Амерыканскія універсітэты станавіліся складальнай часткай ваенна-прамысловага комплексу [2, с. 790].

***Прафсаюзы і рост дабрабыту.*** Мабілізацыя эканомікі краіны прывяла да беспрэцэдэнтнага росту дабрабыту наёмных работнікаў. З 1939 па 1945 г. іх заробкі выраслі у больш чым два разы. Гады вайны былі спрыяльнымі для росту і ўмацавання прафсаюзаў, колькасць якіх павялічылася з 10 да 15 млн чалавек. Імкнучыся забяспечыць мір у прамысловасці, урад ліквідаваў перашкоды на шляху кааптацыі прафсаюзамі новых членаў. Яму ўдалося дабіцца дамоўленасці аб 15-працэнтным паталку абмежавання росту заработнай платы і фактычнай адмове прафсаюзаў ад забастовак як сродку націску на ўрад. З яго згоды тысячы новых работнікаў ваенных заводаў аўтаматычна станавіліся членамі прафсаюзаў. Для спынення незаконных забастовак у 1943 г. быў прыняты закон Сміта – Канолі, які ўводзіў 30-дзённы ахаладжальны перыяд і даваў права выканальніцкай уладзе ўзяць, у выпадку неабходнасці, пад свой кантроль забаставаўшае прадпрыемства. З 1940 па 1945 г. колькасць прафсаюзаў узрасла з 8,5 да 14,75 млн чалавек, ці ў пяць разоў у параўнанні з 1933 г. [3, с. 85–86].

Эканамічны бум і барацьба прафсаюзаў прынесілі свой плён. Узровень заработнай платы ў 1945 г. склаў 135 % ад узроўню 1940 г. З 1942 па 1945 г. банкаўскія зберажэнні амерыканцаў выраслі з 32,4 да 51,4 млрд долараў [2, с. 791]. Колькасць амерыканцаў, якія атрымлівалі даходы менш чым 3 тыс. долараў (у доларах 1968 г.), скарацілася напалову [3, с. 112]. З мэтай эканоміі неабходных для ваенных патрэб сыравіны і матэрыялаў з 1942 г. у краіне была ўведзена картачная сістэма, абмежаванне 90 % тавараў 600 тыс. магазінах па ўсёй краіне, рацыяніраванне мяса, сыру (картачкі чырвонага колеру), кансервы (картачкі блакітанага колеру), картачкі на каву, бензін, аўтамабільныя пакрышкі, іншыя тавары. Дзяржава кантралявала выкарыстанне скуры для вытворчасці абутку, рызіны для сподняй бялізны, тканін для адзежы. Вытворцам адзежы, напрыклад, забаранялася выкарыстоўваць «маланкі», неабходныя, як лічылася, для ваеннай адзежы. Сістэма працавала без збояў. Паралельна існаваў нелегальны «чорны рынак» тавараў, які мог задавальняць практычна любыя патрэбы заможных амерыканцаў. Нягледзячы на існаванне абмежавання з 1940 па 1944 г. сярэдні кошт пакупкі ва універмагах узрос з 2 да 10 долараў, аб'ём гаспадарчай дзейнасці начных клубаў вырас на 35 %, агульны кошт спажывецкіх расходаў амерыканцаў павялічыўся ў два разы. Аднак найбольш істотным вынікам стаў не непасрэдны рост дабрабыту, а даволі абгрунтаваныя надзеі на будучыню, тое, што мільёны амерыканцаў валодалі сродкамі для куплі дома, аўтамабіля, тавараў працяглага карыстання. К канцу вайны накапленні амерыканцаў склалі 140 млрд долараў. У пачатку вайны яны валодалі толькі 50 млрд [3, с. 9–10].

Рост даходаў не абазначаў адсутнасць праблем. Масавая міграцыя прыводзіла да таго, што не хапала жылля, навучальных устаноў, амерыканцам, якія працавалі на ваенных прадпрыемствах, прыходзілася жыць у «Гувервілях» – палатачных гарадках, трэйлерах, фанерных доміках. У прамысловым цэнтры Мабайл рабочыя спалі па зменах на адных і тых жа ложках. У Вашынгтоне час знаходжання ў гасцініцах абмяжоўваўся тэрмінам у 3 дні.

Важнейшай задачай урада было зрабіць вайну рэальнасцю для амерыканцаў. Бліжэйшы тэатр ваенных дзеянняў быў не бліжэй 4,5 тыс. км ад амерыканцаў. Сваю ролю адыграла створанае ўрадам Інфармацыйнае ваеннае бюро, якое наладзіла масавую вытворчасць агітацыйных фільмаў, радыёперадач, плакатаў. У радыёперадачах гучалі заклікі збіраць каляровыя металы, эканоміць раслінны тлушч, неабходныя для вытворчасці гліцэрыны.

Акрамя непазбежнай у такіх выпадках рамантызацыі і праслаўлення ўласнай арміі глыбокае ўздзеянне на амерыканцаў мелі рэпартажы з палёў бітваў. Папулярные ваенныя карэспандэнты Эрні Пайл і Біл Молдзін звярталіся да чалавечых пачуццяў суайчыннікаў, расказвалі аб цяжкасцях і штодзённых небяспеках, аб шматлікіх прыкладах асабістай мужнасці, спачування і чалавечага ўдзелу. Праўда аб перажываннях салдат набліжала падзеі вайны да амерыканцаў. Па сутнасці, такую ролю адыграла кампанія па продажы насельніцтву акцый Ваеннай пазыкі, ініцыіраваная міністрам фінансаў Г. Маргентау. Кампанія набыла агульнанацыянальны характар. Кіназоркі Галівуда падарожнічалі па краіне, абяцалі спатканні і пацалункі пакупнікам пазыкі. Толькі іх намаганнямі было прададзена акцый на 1 млрд долараў. Такую ж суму патрацілі, набываючы спецыяльныя маркі і акцыі, амерыканскія дзеці. Арганізацыя байскаутаў здолела прадаць акцый на 8 млрд долараў. Разлік апраўдаўся. Паступова фарміраваўся неабходны для аб'яднання агульных намаганняў дух нацыянальнага яднання, агульнасці, які так рэдка здараўся, а таму быў цанімым схільнымі да індывідуалізму амерыканцамі.

***Армія.*** З агульнай колькасці ўзброеных сіл у 1945 г. у 11,3 млн чалавек 4,3 млн амерыканцаў служылі на флоце, 670 тыс. у марской пяхоце. Сярэдні тэрмін службы ў баявых часцях не перавышаў 16 месяцаў. Страты склалі 405 тыс. чалавек, што было больш толькі страт, панесеных падчас грамадзянскай вайны.

Для большасці прызваных у армію амерыканцаў вайна стала першым і часта адзіным во-

пытам адрыву ад прывычнага жыццёвага асяроддзя. Але адзінота, туга па доме і родных былі найменшымі з зол. Пагроза смерці, страта таварышаў, цяжар ваеннага жыцця, непазбежная жорсткасць бою прыводзілі да таго, што, як успаміналі ветэраны, слёзы і псіхалагічныя зрывы не расцэньваліся баявымі таварышамі як баязлівасць, калі салдат працягваў выконваць свой абавязак. Толькі ў 1980 г. Амерыканская асацыяцыя прызнала посттраўматычны сіндром у якасці хваробы. Сімптомы гэтай хваробы ў выглядзе бяссонніцы, беспрычынных прыступаў гневу, дэпрэсіі, алкагалізму праяўляліся ва ўдзельнікаў падчас і на працягу многіх гадоў пасля заканчэння ваенных дзеянняў.

***Афраамерыканцы.*** Патрэбы вайны стымулявалі расшырэнне прысутнасці ў арміі афраамерыканцаў, што спрыяла прагрэсу ў іх барацьбе за роўнае з белымі амерыканцамі становішча. Па рашэнні ўрада, яны ўпершыню сталі прызывацца ў элітныя падраздзяленні марской пяхоты. З выпускнікоў лётнай школы Таскеджы ў Алабаме была сфарміравана цалкам з чорных амерыканцаў 99-я эскадрылля знішчальнікаў. 90 лётчыкаў эскадрыллі былі ўзнагароджаны вышэйшай узнагародаў «Крыжом за выдатныя лётныя заслугі», а камандзір падраздзялення палкоўнік Бенджамін О. Дэвіс у 1940 г. стаў першым афраамерыканцам, узведзеным у чын брыгаднага генерала.

Працэнт прызваных у армію афраамерыканцаў на 60 % перавышаў іх долю ў насельніцтве краіны. Тым не менш, у ваенных лагерах на поўдні краіны квітнеў расізм. Мелі месца шматлікія інцыдэнты паміж грамадзянскім белым насельніцтвам і чорнымі ваеннаслужачымі. Прынятае Міністэрствам абароны рашэнне аб скасаванні сегрэгацыі на ваенным транспарце і месцах адпачынку ігнаравалася камандаваннем і фактычна не выконвалася. Многія армейскія падраздзяленні заставаліся фактычна сегрэгаванымі – афраамерыканцы былі прымушаны асобна харчавацца, спаць і хадзіць у царкву. У 1944 г. у Паўночнай Караліне суд апраўдаў белага вадзіцеля аўтобуса, які забіў чорнага салдата. Аддзяленні Чырвонага крыжа падзялялі донарскую кроў чорных і белых амерыканцаў. Сімвалічным было тое, што кансервацыя крыві здзяйснялася метадам, які распрацаваў чарнаскуры ўрач Ч. Дру. Гэта не магло не выклікаць абурэнне афраамерыканцаў, многія з якіх лічылі, што вайна – гэта справа белых. Удзел у Першай сусветнай вайне ніяк не змяніў становішча неграў, што будзе і на гэты раз, а амерыканскі расізм блізкім да нацысцкай расавай тэорыі і практыкі. Большасць членаў арганізацый, якія змагаліся за грамадзянскія правы неграў, прытрымліваліся іншага пункта гледжання. Яны заяўлялі, што дабіваюцца дзвюх перамог (Double «V»), што іх мэтай з'яўляецца і перамога над знешнім ворагам і рашучае змяненне становішча афраамерыканцаў унутры краіны.

Да пачатку вайны 75 % афраамерыканцаў жылі на поўдні краіны. Вынікам ваеннага буму стала іх міграцыя (не менш чым 2 млн) з паўднёвых у паўночныя і заходнія штаты. Больш за 75 % перасяленцаў аселі ў гарадах Каліфорніі, Агайа, Ілінойса, Мічыгана, Нью-Йорка і Пенсільваніі. Палова з іх сталі членамі прафсаюзаў. У 1941 г. прафсаюз афраамерыканцаў праваднікоў чыгуначных вагонаў на чале з А.Ф. Рандольфам здолеў арганізаваць рух «Паход на Вашынгтон», патрабаваннямі якога сталі роўнасць пры найме на работу і ў аплаце працы. Непасрэдным вынікам актыўнасці афра-амерыканцаў стаў спецыяльны ўказ Ф. Рузвельта № 8802 1941 г. і стварэнне спецыяльнага Камітэта па справялівым найме на работу пры прэзідэнце, які вызначаў сваёй мэтай забарону расавай, рэлігійнай і нацыянальнай дыскрымінацыі пры найме на работу і ва ўмовах працы на ваенных вытворчасцях [2, с. 798].

Колькасць афраамерыканцаў, якія працавалі ў прамысловасці, узрасла з 500 тыс. да 1,2 млн чалавек. Палепшылася становішча афраамерыканак, 70 % якіх у 1930-я гг. працавалі ў якасці хатніх служанак. Гэта лічба скарацілася да 48 %, у той час як працэнт, занятых у прамысловасці, узрос з 7,3 да 18,6 % [2, с. 799].

Матэрыяльнае становішча афраамерыканцаў паляпшалася, але гэта адбывалася паралельна з няспыннымі сутыкненнямі з па-расісцку настроенымі мясцовымі жыхарамі і захоўваўшымі расавыя забабоны белымі перасяленцамі, больш паловы з якіх у 1942 г. падтрымлівалі ідэі сегрэгацыі, лічылі, што бядотнае становішча чорнага насельніцтва звязана выключна з іх лянотай і непаўнацэннасцю. 13 нацыянальных прафсаюзаў выключылі неграў са свайго складу. На караблебудаўнічых верфях, на транспарце мелі месца забастоўкі белых рабочых у адказ на спробы прыёму на работу ці павышэнне па службе афраамерыканцаў, таму працэнт апошніх, якія мелі высокааплатнае месца работы ў прамысловасці, не перавышаў 8 %. Усё гэта не магло не прыводзіць да жорсткіх міжрасавых сутыкненняў. На працягу 1943 г. былі адзначаны 250 расавых канфліктаў.

Паказальнымі сталі падзеі ў чэрвені 1943 г. у Дэтройце. Прыток у гэты буйнейшы прамысловы цэнтр негрыцянскіх перасяленцаў параджаў шматлікія праблемы. Адсутнасць жылля і нежаданне мясцовага насельніцтва бачыць сваімі суседзямі афраамерыканцаў прывялі да іх рассялення ў мала прыстасаваным для жылля раёне «Райская даліна». Раён не меў неабходнай інфраструктуры, месц адпачынку і стаў фактычна негрыцянскім гета. Будаўніцтва жылля ў іншым раёне горада выклікала пратэсты расістаў. Войскі былі вымушаны ахоўваць негрыцянскія раё-

ны. Прычынай сутыкненняў паслужыла спроба афраамерыканца пакупацца ў частцы сажалкі, якая мела знак «толькі для белых». Яго закідалі камянямі. Распаўсюджанне навіны і чутак аб гэтым інцыдэнце абвастрыла сітуацыю ў горадзе. Афраамерыканцы выпіхвалі белых амерыканцаў з аўтобусаў, кідалі камяні ў паліцэйскіх. Групы белых расістаў пераварочвалі, аблівалі бензінам і падпальвалі аўтобусы і аўтамабілі, білі афраамерыканцаў. Мелі месца масавыя бойкі, падпалы і акты вандалізму. Парадак у горадзе ўдалося аднавіць толькі з дапамогай уведзеных армейскіх часцей. Сотні атрымалі раненні, загінулі 25 чорных і 9 белых амерыканцаў.

Занятая вайной адміністрацыя не рабіла нічога істотнага для выяўлення прычын і спынення насілля. Для часткі ўрада былі характэрны расісцкія погляды. Міністр абароны Г. Сцімсан сцвярджаў, напрыклад, што віна ляжала на радыкальных лідэрах каляровага насельніцтва, якія хочуць выкарыстаць сітуацыю вайны для інстытуалізацыі міжрасавых шлюбаў. Пазіцыю адміністрацыі адлюстроўвала заява яе Інфармацыйнага бюро аб тым, што «разнообразные и многочисленные проблемы межрасовых отношений, антагонизмы большинства и меньшинства не могут быть преодолены в условиях войны... прежде нужно победить в этой войне» [3, с. 19].

Паўсюдна ўзнікалі арганізацыі змагароў за грамадзянскія правы. Колькасць членаў «Нацыянальнай асацыяцыі садзеяння паляпшэнню становішча каляровага насельніцтва» ўзрасла з 50 тыс. у 1940 г. да 450 тыс. у 1946 г. [2, с. 799]. Рух за грамадзянскія правы неграў набываў новыя магчымасці. Палітычныя партыі і прафсаюзы не маглі ігнараваць іх галасы. Сітуацыя ў вялікіх прамысловых гарадах адрознівалася ад правінцыяльнага, скаванага мясцовымі расісцкімі традыцыямі патрыярхальнага Поўдня, мабільнасцю, магчымасцямі бачыць, параўноўваць, атрымліваць больш інфармацыі, уступаць у кантакты з аднадумцамі. Вышэйадзначанае вяло да росту прэтэнзій афраамерыканцаў, узмацняла іх пратэст, рабіла іх дзеянні больш рашучымі.

### Літаратура і крыніцы


1. *Brinkley, A.* The unfinished nation. Concise history of the American people / A. Brinkley. – New York: McGra-Hill, Inc., 1993.
2. *Norton, M., Katzman, D., Escott, P., Chudacoff, H., Paterson, Th., Tuttle, W.* A people and a nation. A history of the United States / M. Norton, D. Katzman, P. Escott, H. Chudacoff, Th. Paterson, W. Tuttle. – Boston: Houghton Company, 1999.
3. *Chafe, W.H.* The unfinished journey. America since World War II / W.H. Chafe. – New York: Oxford University Press, 2003.
4. U.S. Bureau of the Census, Historical statistics of the United States. Colonial times to 1957. – Washington, 1960.


### Summary


*The article deals with economic and social changes in the USA during World War II. Problems of war production, growth of federal government, trade unionism, education and research, changes in the position of African-Americans are tackled and discussed. The author insists that the war happened to be a turning point in American modern history. All mentioned phenomena and trends had long-term consequences and became a blue-print for post-war economy and social development.*